УДК 351/354 (476-15) (091) "1939"

# ГРАМАДСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ УСТАЛЯВАННЯ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ВЕРАСНІ – КАСТРЫЧНІКУ 1939 г.

***А.Д. Русін***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,* his.rusinOD@bsu.by

Уз’ёднанне БССР у верасні 1939 г. стала магчымым дзякуючы не толькі знешнепалітычным падзеям Другой сусветнай вайны, але і падтрымцы насельніцтвам Заходняй Беларусі ўсталявання савецкай уладай. Пасля ўступлення Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь мясцовае насельніцтва прыняло ўдзел у фарміраванні органаў савецкай улады і ажыццяўленні першых сацыялістычных пераўтварэнняў. Адначасова грамадства Заходняй Беларусі выказала падтрымку савецкай уладзе на выбарах у Народны сход Заходняй Беларусі.

***Ключавыя словы:*** *Народны сход Заходняй Беларусі; часовыя органы савецкай улады; рабочая гвардыя; бежанцы; сялянскія камітэты; левая інтэлігенцыя.*

# ОБЩЕСТВЕННАЯ ИНИЦИАТИВА В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В УСЛОВИЯХ УСТАНОВЛЕНИЯ СОВЕТСКОЙ ВЛАСТИ В СЕНТЯБРЕ – ОКТЯБРЕ 1939 г.

***О.Д. Русин***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,* his.rusinOD@bsu.by

Воссоединение БССР в сентябре 1939 г. стало возможным благодаря не только внешнеполитическим событиям Второй мировой войны, но и поддержке населением Западной Беларуси установления советской властью. После вступления Красной Армии в Западную Беларусь местное население приняло участие в формировании органов советской власти и осуществлении первых социалистических преобразований. Одновременно общество Западной Беларуси выразило поддержку советской власти на выборах в Народное собрание Западной Беларуси.

***Ключевые слова:*** *Народное собрание Западной Белоруссии; временные органы советской власти; рабочая гвардия; беженцы; крестьянские комитеты; левая интеллигенция.*

# PUBLIC INITIATIVE IN WESTERN BELARUS IN THE CONDITIONS OF THE ESTABLISHMENT OF SOVIET POWER IN SEPTEMBER – OCTOBER 1939

***A. Rusiн***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, his.rusinOD@bsu.by*

The reunification of the BSSR in September 1939 became possible thanks not only to the foreign policy events of the Second World War, but also to the support of the population of Western Belarus for the establishment of the Soviet government. After the entry of the Red Army into Western Belarus, the local population took part in the formation of Soviet authorities and the implementation of the first socialist re-formations. At the same time, the society of Western Belarus expressed its support for the Soviet government in the elections to the People's Assembly of Western Belarus.

***Keywords:*** *People's Assembly of Western Belarus; the temporary organs of Soviet power; workers' guard; refugees; peasant committees; the left intylegentsyya.*

Ажыўленне грамадскага жыцця на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбылося ва ўмовах краху польскай дзяржавы падчас вераснёўскай ваеннай кампаніі 1939 года. Адметную ролю ў распаўсюджванні настрояў адыгралі бежанцы з унутраных раёнаў Польшчы, якія шукалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі паратунку ад нацысцкай агрэсіі. Адсутнасць цэнтралізаванага кіравання з боку польскага ўрада фактычна не дазволіла арганізаваць эфектыўнае супраціўленне савецкім войскам. Асобныя сутычкі польскіх вайскоўцаў і паліцэйскіх з'яўляюцца хутчэй выключэннем з агульнай карціны. Насельніцтва Заходняй Беларусі ў падобных ваенна-палітычных умовах уяўляла сваю будучыню па-рознаму.

Згодна ўспамінам «Записки западного белоруса» І.П. Данілава, ужо 10 верасня 1939 г. адбывалася будаўніцтва трыумфальнай аркі для сустрэчы Чырвонай Арміі. Аднак на той момант ставіць яе было яшчэ небяспечна, бо нешматлікія атрады памежнай стражы расстрэльвалі на месцы камуністычных актывістаў. Аўтар прыводзіць сведчанні, што яшчэ да ўступлення савецкіх войскаў былі спробы раззбраення польскіх вайскоўцаў. У дадзеным кантэксце важна тое, што раззбройвалі толькі салдат, але не памежнікаў, бо апошніх баяліся.

Памежныя войскі  аказаліся больш дысцыплінаванымі, менавіта памежная варта ў складзе 8 тысяч чалавек аказала асноўнае супраціўленне савецкім войскам на працягу 17–25 верасня 1939 г. [3, с. 178].

Значная роля ў абуджэнні грамадскай ініцыятывы належала Ваеннаму савету Беларускага фронту, які 16 верасня 1939 г. выдаў пастанову, згодна якой у часовых упраўленнях гарадоў прадстаўніцтва павінна належыць прадстаўнікам ад рабочых і левай інтэлігенцыі

Успаміны жыхароў Заходняй Беларусі дазваляюць меркаваць аб тых чаканнях, якія існавалі ў грамадстве ў сувязі з уступленнем Чырвонай Арміі. У адносінах да польскага насельніцтва некаторыя рэспандэнты выказвалі негатыў у сувязі з тым, што польскай нацыянальнасці аддавалася перавага пры ўладкаванні на працу. Немалаважным было ўспрыняцце палякамі беларускай культуры як мужыцкай, пры гэтым польская культура лічылася высокай. Нацыянальны аспект узаемаадносін увязваўся з эканамічным становішчам. Так, жыхар г. Брэста Е.С. Коваль указваў на больш прыязнае стаўленне польскай улады да яўрэяў у сувязі з больш высокім дастаткам. Успаміны іншых жыхароў адлюстроўваюць асноўныя накірункі агітацыйна-прапагандысцкай работы Чырвонай Арміі, аснову якіх складалі размовы аб перавагах калгаснага ладу [1, с. 242].

Знаёмства насельніцтва з  савецкай уладай суправаджалася кантактамі жыхароў і прадстаўнікоў савецкай арміі і партыйнага апарату. У працэсе размоў задаваліся пытанні markdownрознага кшталту. Як прыклад можна прывесці наступнае: «Ці праўда, што ў СССР расстрэльваюць за крадзеж адной булкі?» Падобныя пытанні выкліканы адкрытасцю, якая праяўлялася чырвонаармейцамі ў першыя дні паходу. У далейшым ваеннае кіраўніцтва пачало барацьбу з празмернай гаварлівасцю вайскоўцаў і нагадвала пра неабходнасць захоўваць ваенную тайну.

Перыядычны друк СССР у дні паходу Чырвонай Арміі асвятляў некаторыя моманты. 19 верасня 1939 г. перадавы артыкул газеты «Праўда» паведамляў пра станоўчыя адносіны насельніцтва да савецкіх воінаў, якія праяўляліся не толькі ў пабудове ўрачыстых арак і правядзенні мітыгаў. Святочная вопратка з’яўляецца сведчаннем станоўчага ўспрыняцця  значнай часткай грамадства змены ўлады. Газета «Савецкая Беларусь» ад 22 верасня 1939 г. размясціла размову са

старшынёй часовага ўпраўлення ў г. Стоўбцы. Згодна з артыкулам, насельніцтва праяўляла зацікаўленасць у фарміраванні органаў савецкай улады. Аднак найбольш распаўсюджаным было пытанне аб падзеле памешчыцкай зямлі [3, с. 38].

У той жа час існавала больш радыкальная форма падтрымкі Чырвонай Арміі, якая заключалася ў паўстаннях супраць польскай адміністрацыі. Хрэстаматыйным прыкладам з'яўляецца тэрыторыя сучаснага Скідзельскага раёна, дзе былыя члены КПЗБ паднялі паўстанне яшчэ да ўступлення савецкіх войскаў. У выніку польская паліцыя амаль змагла задушыць выступленне, але рэшткі паўстанцкага атрада прынялі ўдзел у штурме Скідзеля разам з рэгулярнай савецкай арміяй.

Адным з накірункаў грамадскай актыўнасці стаў удзел у фарміраванні і функцыянаванні часовых органаў савецкай улады. Звычайна органы выбіраліся на мітынгах, якія былі масавай з'явай падчас уступлення Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Але Загад ад 16 верасня 1939 г. ўстанаўліваў структуру будучых часовых органаў улады. Разам з фарміраваннем часовых органаў улады адбывалася стварэнне рабочай гвардыі. Рабочая гвардыя – гэта ваенізаванае, узброенае фарміраванне працоўных. У асноўным рабочая гвардыя стваралася з працоўных буйных прадпрыемстваў. На чале яе стаяў былы член КПЗБ, які меў рэкамендацыю. 21 верасня 1939 г. камандуючы Беларускім фронтам М. Кавалёў аддаў чарговы загад. Цяпер ён тычыўся стварэння народнай міліцыі і рабочай гвардыі. Менавіта з 21 верасня 1939 г. пачынаецца актыўнае фарміраванне сілавой апоры часовых органаў савецкай улады. Часовыя ўправы, як гэта было сказана ў загадзе, фарміраваліся ў гарадах і паветах. Дадзеныя органы ўлады абапіраліся на падтрымку Чырвонай Арміі, кіраўніцтва якой прызнала Часовыя ўправы адзінымі і законнымі органамі на дадзеным этапе. Пры Часовых управах фарміраваліся аддзелы: прамысловы, аховы здароўя, народнай адукацыі, камунальны, палітычнай асветы, сувязі, забеспячэння харчаваннем. Пры гэтым Часовыя ўправы мелі не толькі гаспадарчую, але і палітычную ўладу [3, с. 459].

З дапамогай дакументаў органаў НКУС можна ўстанавіць, што ініцыятыва ў стварэнні рабочай гвардыі і органаў савецкай улады ў цэлым належала былым палітычным вязням падчас польскай улады. У

прыватнасці, у г. Нясвіжы на чале народнай міліцыі стаў былы палітычны вязень Яворскі, які прабыў у турме 13 гадоў. Дзейнасць народнай міліцыі была скіравана на падтрыманне грамадскага парадку. 21 верасня 1939 г. Л.П. Берыя ўказваў на тое, што вялікую ўвагу органы НКУС сумесна з народнай міліцыяй надавалі канфіскацыі зброі ў насельніцтва. Насельніцтва Стаўбцоў, Валожына, Маладзечна, Нясвіжа добраахвотна здало 374 адзінкі вінтовак і карабінаў, 298 рэвальвераў і больш за 5 тысяч баявых патронаў. Такія лічбы паказваюць на шырокае распаўсюджанне ў верасні 1939 г. сярод насельніцтва агнястрэльнай зброі.

Узнікненне на тэрыторыі Заходняй Беларусі ва ўмовах савецкага паходу сялянскіх камітэтаў заслугоўвае больш дакладнага разгляду. Справа ў тым, што спосаб іх абрання, а таксама змест дзейнасці, на думку У.Ф. Ладысева, з’яўляюцца дэмакратычнымі. Ініцыятыва ў іх стварэнні зыходзіла «знізу», што тлумачыцца ўплывам барацьбы супраць польскай улады ў 1920–1930-я гады. З дадзеным меркаваннем можна пагадзіцца, бо нярэдка дзейнасць сялянскіх камітэтаў уступала ў супярэчнасці з часовымі ўпраўленнямі. Як прыклад, сітуацыя в. Крыпулі Парафіянаўскай воласці, дзе рашэннем сялянскага камітэту была раздзелена памешчыцкая маёмасць, а пасля паступіў загад вярнуць усё, што было забрана з маёнтка, адлюстроўвае супярэчнасці паміж часовымі органамі ўлады і грамадскай ініцыятывай. [6, л. 206–211].

Высокую ступень грамадскай ініцыятывы 25 верасня 1939 г. ў аператыўнай зводцы адзначаў П.К. Панамарэнка. Згодна дакументу, назіраецца вялікі наплыў людзей, якія абвяшчаюць сябе былымі членамі КПЗБ. Пазіцыя іх была нашмат больш радыкальнай, чым у савецкага кіраўніцтва, і заключалася ў патрабаванні разгарнуць як мага большыя рэпрэсіі. З аднаго боку, савецкае кіраўніцтва падтрымлівала ініцыятыву і не адхіляла ад працы, бо быў недахоп партыйных кадраў. З іншага, за падобнымі дзеяннямі, як адзначаў П.К. Панамарэнка, магла хавацца дзейнасць правакатараў [6, л. 206–211].

Разам з павелічэннем колькасці прыхільнікаў стварэння партыйных арганізацый, згодна аператыўнай зводцы, сярод моладзі пашырыўся рух за стварэнне камсамолу. Ужо на 25 верасня 1939 г. да ўступлення ў камсамол было падрыхтавана ад 400 да 500 чалавек. У

цэлым, пазіцыя беларускага сялянства ў адносінах да Чырвонай Арміі была дастаткова прыязнай.

Такім чынам, грамадская ініцыятыва на працягу верасня – кастрычніка 1939 г. адыграла значную ролю ў дапамозе органам савецкай улады. Як правіла, у падтрымку савецкай улады выказваліся былыя члены КПЗБ. З аднаго боку актыўная пазіцыя грамадства дапамагла Чырвонай Арміі ў хутчэйшым выкананні баявой задачы па ліквідацыі рэшткаў польскіх вайсковых фарміраванняў. З іншага, паводзіны грамадства з'яўляюцца індыкатарам адносін да польскай улады і спадзяванняў на перамены. Грамадская ініцыятыва, безумоўна, рэгулявалася савецкай уладай і накіроўвалася ў адпаведнасці з яе тактычнымі і стратэгічнымі мэтамі. Аднак ваенна-палітычныя ўмовы пачатку Другой сусветнай вайны і крах польскай дзяржавы стваралі сітуацыю вакууму ўлады, калі актыўнасць грамадства адбывалася на тэрыторыі, дзе ўжо не існавала польскай адміністрацыі, а рух Чырвонай Арміі затрымліваўся.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Барабаш, В.В. Национально-территориальные преобразования в Западной Беларуси после воссоединения с БССР (1939–1940 гг.) // Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. Мінск, 24 верасня 2009 г. / рэдкал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2010. С. 241–246.

2. Белозорович, В.А. Западнобелорусская деревня в 1939–1953 годах. Гродно: ГрГУ, 2004.

3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. 2006.

4. НКВД в Западной Беларуси: сентябрь–декабрь 1939 г.: док. и материалы / Департамент по арх. и делопроизводству М-ва юстиции Респ. Беларусь, Нац. арх. Респ. Беларусь, Центр. арх. Ком. гос. безопасности Респ. Беларусь, Фонд «Ист. память»; сост.: В.Д. Селеменев, А.Р. Дюков [и др.]. Минск–Москва: Фонд «Ист. память», 2019.

5. Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа: материалы регион. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию воссоед. Западной Беларуси с БССР, 24–25 сент. 2009 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. техн. ун-т; [ред.: Н.Н. Ковалева, Л. Ю. Малыхина]. Брест : БрГТУ, 2009.

6. Письмо секретаря ЦК КП(б)Б П. Пономаренко И.В. Сталину о положении в Западной Беларуси // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 14623. Л. 206–211.

7. Пушкін, І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гады). Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010.
8. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. Кн. 2 / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т. истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. Минск: Беларуская навука, 2014.
9. Трафімчык, А.В. 1939 год і Беларусь: забытая вайна. Мінск: Выдавец А. М. Янушкевіч, 2014.
10. Царюк, И.О. КПБ – организатор культурного строительства в западных областях Белоруссии (1939–1955 гг.). Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1969.

**УДК 94:327(47+57)"1939"**

# БЕЛОРУССКИЙ ЭТНОПОЛИТИЧЕСКИЙ ФАКТОР В РЕГИОНЕ СЕВЕРНОЙ ОКОНЕЧНОСТИ ЛИНИИ КЕРЗОНА (АВГУСТ – ОКТЯБРЬ 1939 г.)

***А.П. Сальков***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,* anatsalkov@mail.ru

Линия Керзона, использовавшаяся как геополитический аргумент для определения государственных границ в Восточной Европе, вызывала наибольшие противоречия в регионе ее северной оконечности. Белорусский этнополитический фактор играл существенную роль в развитии политического кризиса августа – сентября 1939 г., сопровождавшегося трансформацией государственных и административных границ.

***Ключевые слова***: *линия Керзона; этническая граница белорусов; сентябрь 1939 г.*

# БЕЛАРУСКІ ЭТНАПАЛІТЫЧНЫ ФАКТАР У РЭГІЁНЕ ПАЎНОЧНАЙ КАНЕЧНАСЦІ ЛІНІІ КЕРЗОНА (ЖНІВЕНЬ – КАСТРЫЧНІК 1939 г.)

***А.П. Салькоў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,* anatsalkov@mail.ru

Лінія Керзона, якая выкарыстоўвалася як геапалітычны аргумент для вызначэння дзяржаўных меж ва Усходняй Еўропе, выклікала найбольшыя супярэчнасці ў рэгіёне яе паўночнага ўскрайка. Беларускі этнапалітычны фактар адыгрываў істотную ролю ў развіцці палітычнага крызісу жніўня –